# Дабру адкрыюцца сэрцы!

1 кастрычніка, у Дзень пажылых людзей, дырэктар і спецыялісты ДУ «ТЦСАН Ашмянскага раёна» з удзелам начальніка ўпраўлення па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Ашмянскага райвыканкама Яшынай Г. В., валанцёраў –школьнікаў ДУА «СШ №3 г. Ашмяны» правялі акцыю «Дабру адкрыюцца сэрцы».

У рамках акцыі былі наведаны пажылыя людзі, якія знаходзяцца ў бальніцы сястрынскага догляду ў аг. Мураваная Ашмянка, Доме сумеснага самастойнага пражывання для грамадзян пажылога ўзросту і ветэраны ВАВ, якім уручаны салодкія падарункі, падрыхтаваныя сацыяльнымі работнікамі аддзялення сацыяльнай дапамогі дома. Свае музычныя падарункі паднеслі спецыялісты аддзяленняў дзённага знаходжання грамадзян пажылога ўзросту і дзённага знаходжання інвалідаў.







